*УДК 392.1(476.2-37Жыткавічы)*

**В. Н. Абрамовіч**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

*У артыкуле на аснове экспедыцыйных матэрыялаў, запісаных у Жыткавіцкім раёне і апублікаваных у зборніку "Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці" [1], ахарактарызаваны абрады і звычаі, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Увага засяроджана на прыкметах і павер'ях, звязаных з цяжарнасцю жанчыны і нараджэннем дзіцяці, асобных рытуалах хрэсьбіннага застолля.*

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў – адзін з важных відаў традыцыйнай народнай культуры беларусаў, і гэта абумоўлена тым, што нараджэнне дзіцяці заўсёды лічылася не толькі цэнтральнай падзеяй у жыцці, але і сакральнай падзеяй. Адсюль невыпадкова радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі напоўнены мноствам разнастайных прадуцыравальных дзеянняў, скіраваных на захаванне здароўя, забеспячэнне лепшай будучыні, а таксама на прадухіленне няшчасцяў і бед.

У наш час радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі захоўваюцца і сёння ў некаторых рэгіёнах Беларусі, асабліва на тэрыторыі аднаго з раёнаў Гомельскай вобласці – Жыткавіцкага. Важна падкрэсліць, што яны адаптаваліся да сучасных умоў жыцця, але працягваюць захоўваць асобныя традыцыйныя элементы, якія забяспечваюць перадачу маральна-этычных каштоўнасцей з пакалення ў пакаленне. Папулярнымі і сёння застаюцца такія кампаненты, як выбар хросных бацькоў і святкаванне нараджэння дзіцяці,

Як вядома, "у складзе радзіннай абраднасці вызначаюцца тры асноўныя моманты: само нараджэнне, ачышчэнне маці і бабкі-павітухі і прыём у грамадства новага члена" [2, с. 319]. Засяродзім увагу на прыкметах і павер'ях, звязаных з цяжарнасцю жанчыны. З самага пачатку цяжарная жанчына знаходзілася пад уважлівым наглядам з боку сям'і. Верылі, што яе ўчынкі, паводзіны абавязкова адаб'юцца на здароўі, характары і лёсе дзіцяці, таму для цяжарнай жанчыны існаваў асаблівы звод правіл і паводзін на ўсе выпадкі жыцця. Правілы гэтыя грунтаваліся на ўніверсальным магічным прынцыпе: "*падобнае выклікае падобнае*". Лічылася, што паводзіны цяжарнай жанчыны, рысы

яе характару (працавітасць, клопат пра сям’ю, набожнасць, сумленнасць) непасрэдна ўплываюць на будучыню дзіцяці, уплываючы на яго выхаванне ў будучым як працавітага, добрасумленнага і рэлігійнага чалавека. Адпаведна, парушэнне цяжарнай жанчынай сацыяльных і маральных норм магло, зыходзячы з народных вераванняў, прывесці да нараджэння дзіцяці з негатыўнымі рысамі характару:

*“Цяжарнай жанчыне забаранялася:*

*– пераступаць вяроўку, бо пры нараджэнні пупавіна перадушыць дзіця, вакол горла абаўецца;*

*– стаяць на парозе хаты, бо будуць цяжкія і працяглыя роды;*

*– прасіць ў доўг, бо тое, што папросіш, з’ядуць мышы;*

*– працаваць, асабліва ў святы;*

*– хадзіць на могілкі ці на похараны, бо дзіця народзіцца жоўтае”* (в. Рычоў) [1, с. 224–225].

*“Як бярэменная, то калі спужаесса, то не трэба хватацца за цело, бо дзіця будзе покрытэ пятнамі.*

*Нельзя лезці ў жэрдзіны.*

*– Нельзя, як сціраеш, класці одзежу выкручуную на плечы, штоб пупавіна не завезаласа на шыі дзіцяці”* (в. Пухавічы) [1, с. 227].

Падчас родаў жанчыне-парадзісе дапамагала бабка-павітуха. Звычайна за ёй пасылалі мужа ці замужнюю жанчыну, даючы ім з сабой лустачку хлеба з соллю ў якасці знака павагі і просьбы аб дапамозе. У сваю чаргу, бабка-павітуха, ідучы да парадзіхі, несла пірог ці хлеб, дэманструючы гатоўнасць дапамагчы: *“Павітуха дапамагала парадзісе як магла. Акрамя чыста акушэрскіх прыёмаў, яна выконвала шэраг магічных дзеянняў, заснаванных на веры ў звышнатуральныя сілы. На парадзісе расшпілялі ўсе гузікі, развязвалі вузлы, паясы, расплятаalmost косы, адкрывалі ўсе замкі, дзверы, куфры ў хаце. Бабка шаптала замовы, пастуквала венікам у столь, як бы звяртаючыся за дапамогай да дамавіка. Вадзіла парадзіху тры разы вакол стала і праз ганак, якія лічыліся свяшчэннымі месцамі хаты. Дзейсным сродкам абялгчэння пакут парадзіхі лічыўся такі: зняць у дзяжы абруч і надзець яго тры разы на парадзіху зверху ўніз”* (в. Азяраны) [1, с. 221].

На працягу жыцця бабка-павітуха падтрымлівала адносіны з дзецьмі, якіх яна бабіла, рабіла ім падарункі на святы. Неўзабаве пасля родаў сяброўкі і сваячкі парадзіхі прыходзілі яе адведваць. У гэтых візітах, якія не патрабавалі спецыяльнага запрашэння, удзельнічалі толькі замужнія жанчыны. Наведванне суседкамі жанчыны-парадзіхі было абавязковым: верылі, што жанчыну, якая не прыйшла да сяброўкі, чакала асуджэнне з боку грамадства. Госці прыносілі з сабой такія пачастункі, як пірагі, бліны або хлеб, і праводзілі час у размовах аб

родах і сваім уласным вопыце. Адведкі былі прызначаны для матэрыяльнай падтрымкі жанчыны-парадзіхі. Важна адзначыць, што, калі дзіця яшчэ не было ахрышчана, яго маглі нават не паказваць гасцям.

Усе абрадавыя дзеянні, якія праводзілі з нованароджаным, былі скіраваны на тое, каб магічным чынам забяспечыць яму добрую долю і здароўе. "*Павітуха ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а накрывала іх якім-небудзь старым адзеннем, каб у будучым дзіця жыло ў багацці. Часам жартам павітуха загортвала хлопчыка ў жаночую сарочку, каб яго, як падрасце, любілі дзяўчаты*" (в. Азяраны) [1, с. 221]. Затым бабка-павітуха перавязвала пупавіну чыстай ільняной ніткай, пасля чаго перараза́ла яе. Пры гэтым выбар прадмета для пераразання залежаў ад полу дзіцяці. Як сведчаць фактычныя матэрыялы, пупавіну перавязвалі хлопчыкам – на сякеры, нажы, кары дуба ці малатку, а дзяўчынкам – на грэбні, верацяне або нітках, што сімвалічна ўплывала на вызначэнне ў будучым іх прафесійных заняткаў. Калі пупавіна адпадала (прыкладна праз 4–5 дзён), то яе клалі ў дзірку, што была ў сцяне хаты. Калі дзіця дасягала 7 гадоў, яму прапаноўвалі развязаць вузельчык з пупавінай, што, лічылася, магло паспрыяць яго разумоваму развіццю.

Першыя тры дні пасля нараджэння былі поўныя абмежаванняў, бо нараджэнне лічылася пераходам дзіцяці з чэрава маці ў іншы свет. У гэты перыяд было строга забаронена што-небудзь выносіць з хаты або даваць у пазыку як сваім, так і чужым: *"Ето для того, коб у хаці царыў покой, гетэ закрывало падход до сем'і і хазяйства тым, хто можэ навесці нячысту сілу і ўкрасці долю маленькага. Гетэ ж робілось, колі і хозяйство прыносіло прыплод"* (в. М. Малешаў) [1, с. 223].

На дзявяты дзень пасля нараджэння бабка-павітуха праводзіла абрад першага купання дзіцяці. Ваду не кіпяцілі, баючыся, што кіпячоная вада зробіць дзіця злым і крыклівым (пра чалавека са скандальным характарам гаварылі: "У гарачай вадзе купаны"). Падчас купання немаўляці выкарыстоўвалі розныя сімвалічныя прадметы, напрыклад, хлопчыку ў ваду клалі зярняты жыта для здароўя і працягу роду, пярсцёнак для пераймання бацькавай справы, а дзяўчынцы – аднакапеечную манету, каб палегчыць менструальны цыкл.

Беларусы вельмі адказна падыходзілі да выбару кумоў, а само хрышчэнне праводзілі да 40-га дня. Выбіралі імя хросных бацькоў. Існавала павер'е, што да хрышчэння нельга паказваць дзіця незнаёмым людзям: *"За дзень да хрысцін, а яны праводзіліся абавязкова ў нядзелю, бацька дзіцяці нёс у хату хросным бацькам і бабцы-павітусе хлеб-соль, завёрнуты ў ручнік ці кавалак палатна, і запрашаў на хрысціны. На другі дзень з самай раніцы прыходзілі хросныя бацькі і бабка-павітуха.*

*Яны ішлі не з пустымі рукамі: хросная маці брала з сабой "мятліка" (такі падарунак, які потым зносіць дзіця), бацька хросны браў грошы, а бабка несла адзенне, у якое будзе апранацца дзіця ў царкве. Спачатку бабка мыла дзіця вадою з мака, апранала яго адзеннем, прыказваючы: "Як я цябе адзявала, так штоб вяселле даждала. Дай, Бог, табе гэтае адзенне знасіці і нам усім любым быці. Каб ты.ю мой унучак, рос да прыбываў, да каралём стаў. А зараз я цябе хрышчу, перахрышчаю і да хроснай маці пасылаю"( у гэты момант аддае дзіця хроснай маці)"* (в. Дзякавічы) [1, с. 221–222].

Хросныя бацькі адыгрывалі ключавую ролю ў жыцці чалавека. Яны неслі адказнасць за маральнае выхаванне хроснікаў, з'яўляючыся аўтарытэтнымі дарадцамі. Менавіта кум і кума аказвалі матэрыяльную дапамогу і нават бралі на выхаванне дзяцей, калі адбывалася бяда з іх бацькамі. У выбары кумоў існавалі два падыходы. Адны аддавалі перавагу сваякам, што забяспечвала ўмацаванне роду. Іншыя, наадварот, запрашалі людзей "збоку", пры гэтым хросных бацькоў заўсёды лічылі блізкімі людзьмі.

Хрысцілі дзіця звычайна пад вечар. Як правіла, бацькі дзіцяці не прымалі ўдзел ў хрышчэнні. Яны заставаліся дома і рыхтавалі хрэсьбінны стол. Пакуль ішло хрышчэнне, маці імкнулася зрабіць як мага больш працы па гаспадарцы, верачы, што гэта прынясе дзіцяці працавітасць у будучыні. Падчас самога абраду хрышчэння назіралі за паводзінамі дзіцяці, каб прадказаць яго лёс.

Абрад хрышчэння завяршаўся хрэсьбінамі, якія праводзілі бацькі нованароджанага. Гэта было своеасаблівае прызнанне і прыняцце новага члена ў грамаду, таму ўдзел у святкаванні бралі толькі дарослыя, жанатыя члены абшчыны, а прысутнасць моладзі не віталася. Як і ўсе значныя першыя падзеі ў жыцці, хрэсьбіны лічыліся вызначальнымі для далейшага лёсу дзіцяці. Ключавыя ролі ў гэтым абрадзе адводзіліся кумам і бабцы-павітусе. "*Самыя ганаровыя месцы за сталом, у святкаванні хрэсьбін, належалі куму і куме. Кумы павінны былі сядзець як мага бліжэй адзін да аднаго, каб у дзіцяці былі густыя зубы і каб жыло ў згодзе з другімі людзьмі*" (в. Азяраны) [1, с. 221], Каб жыццё дзіцяці было доўгім і спакойным, сталы ставіліся ў прамую лінію.

Бабіна каша лічылася галоўнай абрадавай стравай на хрэсьбінах. Гэта была грэцкая, ячная, пшонная ці рысавая каша, якую бабка-павітуха варыла на малацэ, запраўляла маслам ці салам, мёдам, цукрам. Для яе прыгатавання звычайна купляўся новы гаршчок. Бабка-павітуха ўрачыста несла па вуліцы гаршчок з кашай у спецыяльным кошыку, сплеценым з лазы. *"Кашу ставілі на стол і куплялі яе, лажылі грошы, падаркі. У гэтым торзе патрэбна, каб перамог кум. Хто пераможа ў грошах, той і б'е кашу. Калі білі гаршок, гаварылі: "Дзе чарапкі б'юцца, там дзеці*

*вядуцца"* (в. Рычоў) [1, с. 225].

У параўнанні з фальклорам іншых усходнеславянскіх народаў, унікальнай асаблівасцю беларускай традыцыйнай культуры з'яўляецца захаванне ў рэпертуары жыхароў хрэсьбінных песень. Варта адзначыць, што беларускія хрэсьбіны вылучаюцца сваёй карнавальнасцю і выкананнем жартаўлівых сцэнак, дыялогаў: *"На хрэсьбінах спяваліся прыпеўкі і пра кумоў:*

*Кум куму любіў,*
*Па саду вадзіў.*
*А чаго ж мне кумы*
*Да й не любіці, Па зялёнаму саду*
*Да й не вадзіці"* (в. Азяраны) [1, с. 221].
*"Ой, куме, куме,*
*Добра гарэлка.*
*Будумо піці*
*До понедзелка "* (в. Рычоў) [1, с. 225].

На трэці дзень пасля хрышчэння праводзіўся абрад ачышчэння. Дзіця купалі, пакуль збіраліся госці. Рабілася асаблівая сумесь з вады, аўса і хмелю. Бабка-павітуха купала дзіця, а потым ваду вылівалі ў тое месца, дзе ніхто не ходзіць.

Такім чынам, радзінна-хрэсьбінныя абрады, звычаі і песні Жыткавіцкага Палесся, з'яўляючыся важнай часткай фальклорнай спадчыны беларусаў, дапамагаюць асэнсаваць светапогляд нашых продкаў, зразумець семантыку абрадавых дзеянняў, а таксама пацвярджаюць багацце рэгіянальна-лакальных асаблівасцей.

**Спіс літаратуры**

1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў ( на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-укладальнікі Новак В. С., Шынкарэнка В. К., Кастрыца А. А., Воінава А. М., Вяргеенка С. А., Палуян А. М.., Партнова-Шахоўская А. У. – Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

2 Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин. – М. : Наука, 1991. – 511 с.